


12:00, 22 ЧЭРВЕНЯ – ЖЫХАРЫ АСІПОВІЦКАГА РАЁНА ДАВЕДАЛІСЯ ПРА ПАЧАТАК ВАЙНЫ.

23–25 ЧЭРВЕНЯ – РАЙВАЕНКАМАТ АРГАНІЗАВАНА ПРАВЁЎ МАБІЛІЗАЦЫЮ ВАЕННААБАВЯЗАНЫХ.

НОЧ З 22 НА 23 ЧЭРВЕНЯ – ПЕРШЫЯ ЎДАРЫ НЯМЕЦКАЙ АВІЯЦЫІ ПА АСІПОВІЦКІМ ЧЫГУНАЧНЫМ ВУЗЛЕ І ВАЕННЫМ ГАРАДКУ.

30 ЧЭРВЕНЯ – ГІТЛЕРАЎЦЫ ЗАНЯЛІ ГОРАД АСІПОВІЧЫ.

2 ЛІПЕНЯ – АКУПІРАВАНЫ ЎВЕСЬ АСІПОВІЦКІ РАЁН.

ПАЧАТАК ЛІПЕНЯ – Ў АСІПОВІЧАХ СТВОРАНА ЯЎРЭЙСКАЕ ГЕТА.

ЛІПЕНЬ – РАССТРЭЛ У ЛАПІЦКІМ ЛЕСЕ.

З 9 ЛІПЕНЯ АСІПОВІЦКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ КП(б)Б СТАЎ БАЯВЫМ ШТАБАМ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І КІРАЎНІЦТВЕ ПАДПОЛЛЕМ І БАЯВЫМІ ДЗЕЯННЯМІ ПАРТЫЗАН У РАЁНЕ.

ЛІПЕНЬ–ВЕРАСЕНЬ – Ў РАЁНЕ СТВОРАНА 6 ДЫВЕРСІЙНА-РАЗВЕДВАЛЬНЫХ ГРУП.

СЯРЭДЗІНА ЖНІЎНЯ – У ВАКОЛІЦАХ ВЁСКІ ЛОЧЫН З'ЯВІЛІСЯ ПЕРШЫЯ ПАРТЫЗАНЫ.

11 КАСТРЫЧНІКА – РАССТРАЛЯНА ДАРОСЛАЕ ПРАЦАЗДОЛЬНАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА АСІПОВІЦКАГА ГЕТА.




# 1942

ПАЧАТАК ГОДА – У РАЁНЕ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ 10 ПАРТЫЗАНСКІХ ГРУП.

7 СТУДЗЕНЯ – ПЕРШАЯ КАРНАЯ АПЕРАЦЫЯ Ў ВЁСЦЫ ЛОЧЫН.

ЛЮТЫ – КАРНАЯ АПЕРАЦЫЯ Ў ВЁСЦЫ ПАГАРЭЛАЕ.

5 ЛЮТАГА – ЯЎРЭЙСКАЕ ГЕТА Ў АСІПОВІЧАХ ЛІКВІДАВАНА.

МАЙ – КАРНАЯ АПЕРАЦЫЯ Ў ВЁСЦЫ ЯСЕНЬ

ЛІПЕНЬ – ПАРТЫЗАНСКІ АТРАД М. П. КАРАЛЁВА ЎКЛЮЧАНЫ Ў СКЛАД КЛІЧАЎСКАГА АПЕРАТЫЎНАГА ЦЭНТРА ЯК АТРАД № 210.

ВЕРАСЕНЬ – ПА ЗАДАННІ ЦК КП(Б)Б У РАЗМЯШЧЭННЕ АСІПОВІЦКІХ ПАРТЫЗАН ПРЫБЫЛА КОННАЯ ГРУПА А. К. ФЛЕГАНТАВА, ЯКАЯ АКАЗАЛА ВЯЛІКУЮ ДАПАМОГУ 210-МУ АТРАДУ.

22 ВЕРАСНЯ – БАБРУЙСКІМ МІЖРАЙКОМАМ БЫЎ ЗАЦВЕРДЖАНЫ АСІПОВІЦКІ ПАДПОЛЬНЫ РК КП(Б)Б (САКРАТАР РУВІМ ХАІМАВІЧ ГОЛАНТ) І НЕКАЛЬКІ ПАЗНЕЙ АСІПОВІЦКІ ПАДПОЛЬНЫ РК ЛКСМБ (САКРАТАР ІВАН ГНЯДЗЬКО).

10 КАСТРЫЧНІКА – РАЙКОМ ЗАЦВЕРДЗІЎ ПАДПОЛЬНУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ НА ЧЫГУНАЧНЫМ ВУЗЛЕ СТАНЦЫІ АСІПОВІЧЫ.

27 ЛІСТАПАДА — АСІПОВІЦКІ РК КП(Б)Б ВЫНЕС РАШЭННЕ АБ ВЫДАННІ РАЁННАЙ ПАДПОЛЬНАЙ ГАЗЕТЫ «ЗА СОВЕТСКУЮ РОДИНУ» (РЭДАКТАР ПАВЕЛ ВАСІЛЬЕВІЧ ТРАЦЭЎСКІ).




# 1943

**СТУДЗЕНЬ** – СПАЛЕНЫ ВЁСКІ БОРТНАЕ, МАЙ, МАКАЎЕ, ЧАРОТ, АСАВОК, БРЫЦАЛАВІЧЫ, БУДА, ВЯРБІЛАВА, ВЯЛІКАЯ ГАРОЖА, МЯЖНОЕ, ГОМАНАЎКА, ЛУЧЫЦЫ, МАКСІМАЎКА, МАЛАЯ ГАРОЖА, РАЖЫШЧА.

**20 СТУДЗЕНЯ** – ПАРТЫЗАНСКІ АТРАД № 210 УВАЙШОЎ ГАЛОЎНЫМ АТРАДАМ У 1-Ю АСІПОВІЦКУЮ БРЫГАДУ.

**МАЙ** – СПАЛЕНЫ ВЁСКІ ВЕСЯЛОВА, ЛОЧЫН, ЛАЗОВАЕ.

**ЧЭРВЕНЬ** – СПАЛЕНЫ ВЁСКІ АСЯРОДАК, ПРУДЗІШЧА, СЛАБАДА.

**ЛІПЕНЬ** – 1-Я АСІПОВІЦКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА БЫЛА ПЕРАЎТВОРАНА Ў АСІПОВІЦКУЮ ВАЕННА-АПЕРАТЫЎНУЮ ГРУПУ (ВАГ) ПАД КАМАНДАВАННЕМ М. КАРАЛЁВА.

**6 ЛІПЕНЯ** – РАЙКОМ ЗАЦВЕРДЗІЎ ПАДПОЛЬНУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ Ў Г. АСІПОВІЧЫ.

**30 ЛІПЕНЯ** — НА ЧЫГУНАЧНАЙ СТАНЦЫІ АСІПОВІЧЫ ФЁДАР АНДРЭЕВІЧ КРЫЛОВІЧ ПРАВЁЎ БУЙНУЮ ДЫВЕРСІЮ, У ВЫНІКУ ЯКОЙ ЗНІШЧАНЫ 4 ВАРОЖЫЯ ЭШАЛОНЫ, У Т.Л. І З НОВЫМІ ТАНКАМІ «ТЫГР» І БРОНЕМАШЫНАМІ.

**ЖНІВЕНЬ** – СПАЛЕНА ВЁСКА СТАРОНКА.

**ВЕРАСЕНЬ** – КАРНЫЯ ОРГАНЫ НАНЕСЛІ ЎДАР ПА АСІПОВІЦКІМ ПАДПОЛЛІ.

**16 ВЕРАСНЯ** – ПАСТАНАЎЛЕННЕМ САВЕЦКАГА ЎРАДА ЗА АРГАНІЗАТАРСКІЯ ЗДОЛЬНАСЦІ, ПАСПЯХОВАЕ ПРАВЯДЗЕННЕ БАЯВЫХ АПЕРАЦЫЙ У ТЫЛЕ ВОРАГА МІКАЛАЮ ПІЛІПАВІЧУ КАРАЛЁВУ БЫЛО ПРЫСВОЕНА ВОІНСКАЕ ЗВАННЕ ГЕНЕРАЛ-МАЁРА.

**КАСТРЫЧНІК** – СПАЛЕНА ВЁСКА ПАБОКАВІЧЫ.

**СНЕЖАНЬ** – СПАЛЕНА ВЁСКА ЛУКА.




# 1944

І СТУДЗЕНЯ – УКАЗАМ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР ЗА ВЫКЛЮЧНЫЯ ЗАСЛУГІ Ў РАЗВІЦЦІ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ Ў РАЁНЕ, АСАБІСТЫ ГЕРАІЗМ І АДВАГУ Ў БАЯВЫХ АПЕРАЦЫЯХ «РЭЙКАВАЙ ВАЙНЫ» МІКАЛАЙ ПІЛІПАВІЧ КАРАЛЁЎ БЫЎ УДАСТОЕНЫ ЗВАННЯ ГЕРОЯ САВЕЦКАГА САЮЗА З УРУЧЭННЕМ ЯМУ ОРДЭНА ЛЕНІНА І МЕДАЛЯ «ЗАЛАТАЯ ЗОРКА».

МАЙ – СПАЛЕНЫ ВЁСКІ РЭПІШЧА, БОЗАК, ПАЛЯДКІ, ВОЛЯ, ЗЯЛЁНАЯ ДУБРАВА.

30 МАЯ – ПАРТЫЗАНСКАМУ АТРАДУ № 210 ПРЫСВОЕНА ІМЯ І. В. СТАЛІНА.

ЧЭРВЕНЬ – СПАЛЕНЫ ВЁСКІ КРАСНІК, СТАЛЯРЫ, СТАНЦЫЯ ЯСЕНЬ.

28 ЧЭРВЕНЯ – ГОРАД АСІПОВІЧЫ БЫЎ ЦАЛКАМ ВЫЗВАЛЕНЫ АД АКУПАНТАЎ.

КАНЕЦ ЧЭРВЕНЯ – АСІПОВІЦКІЯ ПАРТЫЗАНЫ ЗЛІЛІСЯ З ЧАСЦЯМІ НАСТУПАЮЧАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

30 ЧЭРВЕНЯ – ВОЙСКІ 3-Й АРМІІ ПРЫ ЎДЗЕЛЕ ПАРТЫЗАН ПАСПЯХОВА АЧЫСЦІЛІ ПАЎНОЧНУЮ ТЭРЫТОРЫЮ РАЁНА АД ГІТЛЕРАЎСКІХ ЗАХОПНІКАЎ.